Падтрымай "Вясну" на PATREON

Юрыя Мельнікава выкінулі з выбарчай гонкі... з другой спробы

07.11.2019 **Тэгі**: выбары-2019



Як паведамляе назіральніца кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары" **Ірына Траццякова**, 4 і 5 лістапада акруговай выбарчай камісіяй па Віцебскай-Чкалаўскай акрузе №18 было разгледжана два звароты, накіраваных дырэктаркай філіяла «Ваенсервіс» **Ларысай Шыракавай** і калектывам супрацоўнікаў гэтага ж прадпрыемства. У іх заяўнікі скардзіліся на нібыта ілжывую інфармацыю, якую распаўсюдзіў у сваім тэле- і радыёзвароце да выбаршчыкаў кандыдат у дэпутаты **Юры Мельнікаў** - начальнік сектара кадравай і прававой работы філіяла «Ваенсервіс» РУП «Гандлёва-вытворчае ўпраўленне пры Міністэрстве абароны».

У прыватнасці ён сказаў, што *"у сябе на прадпрыемстве выявіў факты карупцыі з боку свайго кіраўніка; з гэтай нагоды праводзіць праверку Міністэрства абароны, спадзяюся, яно прыме правільнае рашэнне і перадасць матэрыялы ў праваахоўныя органы"*.

Дырэктарка філіяла Ларыса Шыракова палічыла такія словы кандыдата абразай і паклёпам на свой адрас, супрацоўнікі напісалі аналагічны зварот па радыёэфіру.

Акруговая камісія разгледзела звароты і вынесла два папярэджанні (за кожны выступ асобна) на падставе адказу Мінабароны без подпісаў і пячатак і кіруючыся арт. 47 Выбарчага кодэкса, дзе забараняецца "абраза і паклёп у дачыненні да службовых асобаў Рэспублікі Беларусь", хоць Ларыса Шыракова такой не з'яўляецца.

6 лістапада Юры Мельнікаў хацеў абскардзіць рашэнне АВК аб двух вынесеных яму папярэджаннях ў абласную выбарчую камісію, аднак там ён убачыў заяву АВК з просьбай адмяніць яго рэгістрацыю кандыдатам і адпаведныя дакументы абласнога выбаркама пра такое рашэнне.

> *«Члены камісіі, не даўшы Юрыю Мельнікаву трохдзённы тэрмін на абскарджанне ў судзе рашэнняў, галасуюць за адмену яго рэгістрацыі ў якасці кандыдата. Я зрабіла заўвагу і заклікала даць кандыдату належныя тэрміны на абскарджанне, на што старшыня камісіі адказаў, што хутка пачнецца выбарчая кампанія ў частцы галасавання, а дзеючы дэпутат Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў і член камісіі* ***Аляксандр Дзядзінкін*** *прапанаваў абскардзіць Мельнікаву "усё разам потым"»*, - адзначыла назіральніца.

Юры Мельнікаў ўсё ж мае намер звярнуцца ў суд.

Нагадаем, кандыдат у дэпутаты Юры Мельнікаў вылучаўся па Віцебскай-Чкалаўскай выбарчай акрузе №18 шляхам збору подпісаў грамадзян і адразу не быў зарэгістраваны АВК з-за недакладнасці подпісаў. Пасля абскарджання ў абласную камісію ён адзіны, хто быў усё ж зарэгістраваны па рашэнні гэтай камісіі.

"Праваабаронцы за свабодныя выбары"

Навіны кампаніі ў фэйсбуку, твітэры і на Тэлеграм-канале

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Жыхарку Фаніпаля асудзілі за ўдзел у акцыі пратэсту з белымі кветкамі і шарыкамі

"Беларусі пахваліцца няма чым". У Вене прайшла кансультацыя пра мірныя пратэсты

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)

"Рэжымныя аб'екты — залатое дно". Былы палітвязень і юрыст "Вясны" — пра прамзону ў калоніі № 17

"Гэта бессэнсоўны акт прапаганды". Былы палітвязень ПК-17 пра сюжэт БТ пра яго калонію (фота)

"Кніга ў зняволенні – гэта больш чым кніга": што чытаюць беларусы ў СІЗА і калоніях?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін (дапоўнена)

"Два гады". Вечар салідарнасці з палітзняволенымі праваабаронцамі "Вясны"

"Заклікаў перакрываць дарогі ў Мікашэвічах і “паклёпнічаў” на Лукашэнку: вынесены прысуд Дзмітрыю Сафановічу

Маці "здала" ўчастковаму сына, які знішчыў чатыры сцягі ў Лошніцы

Вільня: пікет салідарнасці з затрыманымі два гады таму праваабаронцамі "Вясны" (фота)

"Сапраўдныя ваяры дабра, якія ахвяруюць уласнай свабодай дзеля нашай будучыні". Грамадскія дзеячы пра зняволеных вясноўцаў

"Такія пакутныя выпрабаванні прыпалі не толькі на долю праваабаронцаў, але і на долю ўсяго беларускага народу", – Наталля Пінчук

Новыя факты пераследу 14 ліпеня

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

